ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 13 (1125) ● Чацвер, 8 красавіка 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

**11 КРАСАВІКА 1976 ГОДА— ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ У РАЁННЫЯ НАРОДНЫЯ СУДЫ. УСЕ НА ВЫБАРЫ!**

РАШЭННІ XXV З'ЕЗДА КПСС—У ЖЫЦЦЁ

# ДА НОВЫХ ВЫШЫНЬ

**На сумесным паседжанні парткома, савета, мясцкома і камітэта камсамола універсітэта з дакладам «Вынікі дзейнасці калектыву універсітэта ў дзевятай пяцігодцы і задачы па далейшаму дасканаленню вучэбнай, навуковай і палітыка-выхаваўчай работы ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ» выступіў рэктар БДУ імя У. І. Леніна прафесар У. М. Сікорскі.**

Дакладчык адзначыў, што, выконваючы рашэнні XXIV з'езда Кампартыі Беларусі, а таксама чарговыя пастановы партыі і ўрада, калектыў універсітэта за гады дзевятай пяцігодкі правёў значную работу па паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў, развіццю навукі і пастаноўцы камуністычнага выхавання студэнтаў.

Усяго за пяцігоддзе ва універсітэт было прынята 16 929 студэнтаў, з іх 10 233 на дзённую форму навучання, 3 247 — на вячэрнія формы і 3 450 чалавек — на завочныя аддзяленні.

Галоўнымі напрамкамі ўсёй дзейнасці калектыву універсітэта ў дзевятай пяцігодцы з'яўляліся:

— удасканаленне планавання і навуковай арганізацыі вучэбнага працэсу;

— павышэнне кваліфікацыі і метадычнага майстэрства прафесарска-выкладчыцкага саставу;

— укараненне новых прагрэсіўных метадаў навучання з прымяненнем тэхнічных сродкаў;

— узмацненне ідэйна-выхаваўчай работы і на гэтай аснове ўзмацненне вучэбнай дысцыпліны і павышэнне паспяховасці студэнтаў;

— удасканальванне арганізацыі навукова-даследчай работы, павышэнне яе актуальнасці і эфектыўнасці.

У выніку праведзенай работы за пяцігоддзе значна павысілася абсалютная паспяховасць студэнтаў. Калі ў 1970 г. яна складала 89,3, то ў 1975 г. — 94,2 працэнта. Павысілася і якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. Калі ў 1971 г. абаранілі дыпломныя работы на «выдатна» і «добра» 71 працэнт выпускнікоў, то ў 1975 г. — 91. Прычым за апошнія тры гады дыпломныя работы на «выдатна» абаранілі 3029 чалавек, або 42,3 працэнта ўсіх выпускнікоў універсітэта. 750 чалавек у дзевятай пяцігодцы закончылі універсітэт з адзнакай.

Палепшылася вучэбная дысцыпліна студэнтаў, зменшыўся пропуск заняткаў без уважлівых прычын.

Рэктаратам, дэканатамі факультэтаў і калектывамі кафедр у мінулай пяцігодцы ўдзялялася шмат увагі агітацыйна-растлумачальнай рабоце і прафарыентацыі рабочай і сельскай моладзі.

За гады дзевятай пяцігодкі прыняла выразныя арганізацыйныя формы навукова-метадычная работа. Распрацавана «Палажэнне аб арганізацыі навукова-метадычнай работы і формах кіраўніцтва гэтай работай», створаны навукова-метадычны савет універсітэта і вучэбна-метадычныя камісіі факультэтаў і агульнауніверсітэцкіх кафедр, арганізаваны курсавыя і прадметныя камісіі. Асноўнымі іх задачамі з'яўляюцца: распрацоўка пытанняў навуковай арганізацыі вучэбнага працэсу, методыкі і педагогікі вышэйшай школы, абагульненне вопыту і ўкараненне навуковых рэкамендацый у практыку вучэбнай работы, каардынацыя рабочых праграм і работы выхавацеляў сумежных курсаў, удасканальванне ўліку бягучай паспяховасці і арганізацыі самастойнай работы студэнтаў і іншыя пытанні метадычнага характару. Распрацаваны рад дапаможнікаў па найбольш складаных праблемах у курсах выкладаемых дысцыплін, вучэбна-метадычныя планы для студэнтаў малодшых курсаў, выдана больш як 130 метадычных дапаможнікаў.

Больш актыўны ўдзел у дзевятай пяцігодцы прымалі студэнты ў гаспадарчым будаўніцтве. Удзел іх у працоўных семестрах ператварыўся ў саставную частку вучэбна-выхаваўчага працэсу. На працягу пяцігодкі 9175 студэнтаў працавалі на будоўлях у шасці рэспубліках нашай краіны, у ГДР, НРБ, асвоіўшы за гэты перыяд 18 млн. 377 тыс. рублёў капіталаўкладанняў. На сельскагаспадарчыя работы па ўборцы ўраджаю за гады дзевятай пяцігодкі было накіравана 19940 чалавек.

Універсітэт з'яўляецца буйным навуковым цэнтрам рэспублікі і краіны. Факультэты, кафедры і навуковыя ўстановы універсітэта праводзяць фундаментальныя даследаванні і прыкладныя НДР для раду галін народнай гаспадаркі.

За пяцігоддзе лік тэм, распрацоўваемых па кафедральнай тэматыцы, знізіўся з 394 у 1971 годзе да 273 у 1975 годзе. У той жа час узрос лік тэм, выконваемых па плану асноўных НДР універсітэта (1971 г. — 160, 1975 г. — 332).

Асноўнай формай сувязі універсітэта з ведамствамі, прадпрыемствамі, галіновымі НДІ з'яўляюцца гаспадарчадагаворныя работы, якія выконваюцца на аснове навуковых рэзультатаў, атрыманых пры выкананні фундаментальных даследаванняў па дзяржбюджэтнай тэматыцы. Лік такіх работ узрос з 79 у 1971 годзе да 130 у 1975 годзе.

Навуковыя дасягненні дазволілі універсітэту прыняць актыўны ўдзел у выстаўках дасягненняў народнай гаспадаркі СССР і БССР: было прадстаўлена 95 экспанатаў, атрымана 21 узнагарода.

Значна ўзрасла актыўнасць студэнтаў у выкананні навукова-даследчых работ. Калі ў 1970 годзе прымалі ўдзел у НДР 2500 студэнтаў дзённай формы навучання, то ў 1975 г. — 7216. Ва універсітэце функцыянуе 7 студэнцкіх навукова-даследчых фарміраванняў (СНДЛ і СВЦ), у рабоце якіх удзельнічаюць 449 студэнтаў (у 1971 г. — 125). Толькі ў 1974—75 навучальным годзе на рэспубліканскі агляд былі прадстаўлены 663 лепшыя работы студэнтаў, з якіх 16 работ вышэйшай катэгорыі ўдастоены грамат Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і ЦК ЛКСМБ і грашовых прэмій, 188 работ першай катэгорыі адзначаны дыпломамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, 299 работ аднесены да другой і 145 —да трэцяй катэгорыі.

Найбольшых поспехаў у навукова-даследчай рабоце дабіўся калектыў фізічнага факультэта, які на працягу дзевятай пяцігодкі займаў пры падвядзенні штогадовых вынікаў першае месца сярод факультэтаў па арганізацыі і эфектыўнасці правядзення НДР. Другое і трэцяе месцы займалі: хімічны факультэт і факультэт прыкладной матэматыкі.

За буйныя і важныя навуковыя даследаванні і адкрыцці вучоных Дзяржкамітэт Савета Міністраў СССР па навуцы і тэхніцы ўключыў Беларускі дзяржаўны універсітэт у лік 27 вядучых ВНУ краіны.

Прафесарска - выкладчыцкі састаў і студэнты універсітэта вядуць вялікую прапагандысцкую работу сярод працоўных рэспублікі. У 1974-75 гадах члены таварыства «Веды» універсітэта прачыталі на прадпрыемствах, ва ўстановах, калгасах і саўгасах звыш 9 тысяч лекцый.

У дзесятай пяцігодцы нам неабходна ўсе намаганні накіраваць на паспяховае ажыццяўленне рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ у галіне вышэйшай школы. Для гэтага патрэбна многа папрацаваць. Мы павінны разумець, што для павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў патрэбна зрабіць значна больш, чым зроблена. У дзесятай пяцігодцы праблема якасці будзе разглядацца больш глыбока і аб'ёмна, з максімальным улікам праяўленняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі.

Падрыхтоўку будучых спецыялістаў патрэбна ўдасканальваць перш за ўсё ў галіне фундаментальных навук, узбагачаць выкладанне прыродазнаўчых і тэхнічных дысцыплін элементамі гуманітарных ведаў, а вучэбны працэс на гуманітарных факультэтах —матэматычнымі метадамі пазнання.

**(Заканчэнне на 2-й стар.).**

# НАШ КАНДЫДАТ

**Вадзім Сяргеевіч Кандрацьеў зараз народны суддзя нарсуда Кастрычніцкага раёна г. Мінска. Яго кандыдатура зноў вылучана ў народныя суддзі.**

В. С. Кандрацьеў нарадзіўся ў 1944 годзе ў г. Саратаве, камуніст. Працоўную дзейнасць пачаў у 1961 годзе на пасадзе лабаранта Мінскага вышэйшага ваеннага радыётэхнічнага вучылішча. У 1963 годзе паступіў на юрыдычны факультэт БДУ і паспяхова закончыў яго.

Пасля заканчэння універсітэта Вадзім Сяргеевіч працаваў памочнікам пракурора Шаркоўшчынскага раёна Віцебскай вобласці, сакратаром Шаркоўшчынскага райкома камсамола, памочнікам пракурора Кастрычніцкага раёна г. Мінска. Са снежня 1970 года працуе народным суддзёй нарсуда Кастрычніцкага раёна г. Мінска. Таварышы па працы адзываюцца аб ім як аб прынцыповым, добрасумленным працаўніку. В. С. Кандрацьеў забяспечвае правільны разгляд крымінальных і грамадзянскіх спраў, актыўна прапагандуе савецкае заканадаўства сярод насельніцтва раёна, дапамагае народным засядацелям і старшыням таварыскіх судоў у авалоданні юрыдычнымі ведамі. Ён прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці калектыву: на працягу двух гадоў выбіраўся сакратаром партыйнай арганізацыі, у 1975 годзе выбран членам партыйнага бюро. В. С. Кандрацьеў — дастойны кандыдат у народныя суддзі нарсуда Кастрычніцкага раёна г. Мінска па выбарчай акрузе № 1.

## *ТЭЛЕГРАМА Ў НУМАР*

**На выбарчым участку № 1 завяршаецца падрыхтоўка да прадстаячых выбараў у раённыя народныя суды. Поўнасцю ўжо вывешаны спісы выбаршчыкаў, уручаны запрашэнні. Праведзена інструктыўная работа з членамі выбарчай камісіі, агітатарамі і рэгістратарамі з мэтай растлумачэння іх абавязкаў у дзень галасавання. Адказнымі за падрыхтоўку да выбараў складзен план культурных мерапрыемстваў, выдзелены памяшканні і абсталяванне для правядзення галасавання.**

**Усе на выбары!**

*3 красавіка ў актавай зале БДУ адбыўся камсамольскі сход «Рашэнні XXV з'езда КПСС — выканаем» на гістарычным факультэце.*

*НА ЗДЫМКАХ: ідзе камсамольскі сход на гістфаку.*








Фота Т. ПЕТРАШКЕВІЧ.

# ДА НОВЫХ ВЫШЫНЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Патрабуецца павысіць адказнасць кіраўніцтва і партыйных арганізацый факультэтаў, кафедр і навуковых устаноў універсітэта за своечасовае і якаснае выкананне планаў навуковых даследаванняў, канцэнтрацыю сіл і сродкаў на перспектыўнай тэматыцы, якая мае важнае тэарэтычнае і народнагаспадарчае значэнне, абгрунтаванасць прапаноўваемых рэкамендацый, павышэнне эфектыўнасці навуковай работы калектываў і паскарэнне ўкаранення рэзультатаў навуковых дасягненняў у народную гаспадарку.

Выступіўшы на нарадзе намеснік сакратара парткома загадчык кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў **У. Драчоў** адзначыў, што партком універсітэта адразу ж пасля апублікавання з'ездаўскіх матэрыялаў у друку правёў нараду сакратароў партарганізацый, на якой былі вызначаны асноўныя напрамкі ў вывучэнні дакументаў з'ездаў: па-першае, у сістэме палітасветы і, па-другое, сярод супрацоўнікаў і студэнтаў. Партыйны камітэт акцэнтаваў увагу сакратароў партарганізацый на ролі выкладчыкаў кафедр грамадскіх навук у прапагандзе і вывучэнні матэрыялаў з'ездаў. Адным з важнейшых напрамкаў нашай работы, падкрэсліў выступаючы, з'яўляецца павышэнне якасці выкладання грамадскіх дысцыплін. На парткоме абмеркавана пытанне аб ідэалагічным напрамку выкладання гэтых дысцыплін, пры гэтым была звернута ўвага на спецыяльныя кафедры.

Дэкан мехмата **М. Гарашчук,** выступаючы на нарадзе, прывёў лічбавыя даныя, якія сведчаць аб колькасных і якасных зменах, якія адбыліся на факультэце за мінулую пяцігодку. Так, кантынгент студэнтаў, які ў 1971 годзе складаў лічбу 440, у 1975 годзе дасягнуў лічбы 1300. Значна павялічыўся прафесарска-выкладчыцкі састаў. Калі ў 1971 годзе на факультэце працавалі 53 выкладчыкі і супрацоўнікі, то ў цяперашні час мы маем калектыў колькасцю ў 86 чалавек. На факультэце значна актывізавалася індывідуальная работа са студэнтамі. На высокі ўзровень пастаўлена культурна-масавая работа. На адбыўшымся аглядзе-конкурсе мастацкай самадзейнасці мехмат заняў III месца, у той час як тры гады назад не змог прадставіць ніводнага нумара.

Начальнік вылічальнага цэнтра універсітэта А. Пальцаў у сваім выступленні адзначыў істотнае павышэнне арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва ва універсітэце. У 1975 годзе БДУ быў прызнан лепшым сярод ВНУ рэспублікі па арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. Трэба сказаць, што нягледзячы на нашы поспехі, нам належыць звярнуць увагу на некаторыя недахопы нашай работы, у прыватнасці на прытрымліванне прынцыпу галоснасці. У гэтым годзе намі была створана камісія, якая правяла вялікую работу па паляпшэнню нагляднай агітацыі на факультэтах па розных напрамках нашай дзейнасці.

Затым у спрэчках па дакладу выступілі сакратар парткома універсітэта **Т. Дударава,** дэкан фізфака **І. Зяцькоў,** загадчык кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў **Ф. Нячай,** дэкан ФПМ **Іваноў.** З заключным словам выступіў У. Сікорскі. Па дакладу была прынята пастанова.

# ПАСТАНОВА

## СУМЕСНАГА ПАСЕДЖАННЯ ПАРТКОМА, САВЕТА, МЯСЦКОМА І КАМІТЭТА КАМСАМОЛА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад рэктара універсітэта прафесара У. М. Сікорскага «Вынікі дзейнасці калектыву універсітэта ў дзевятай пяцігодцы і задачы па далейшаму дасканаленню вучэбнай, навуковай і палітыка-выхаваўчай работы ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ», партком, савет, мясцком і камітэт камсамола універсітэта адзначаюць, што, выконваючы рашэнні XXIV з'езда КПСС і XXVII з'езда КПБ, а таксама далейшыя пастановы партыі і ўрада, рэктарат, партком, калектывы факультэтаў, кафедр, аддзелаў і служб, партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі за гады дзевятай пяцігодкі прарабілі значную работу па паляпшэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, развіццю навукі і пастаноўцы камуністычнага выхавання студэнтаў. За гэты перыяд павялічыліся маштабы ўсёй працы, сталі найбольш дасканалымі формы і метады навучання студэнтаў, значна павысіўся ўзровень навуковых даследаванняў.

Адкрыты факультэт прыкладной матэматыкі. аддзяленне механікі пры механіка - матэматычным факультэце, ідзе падрыхтоўка па новай спецыяльнасці — біяхіміі — на біялагічным факультэце. Арганізавана 12 новых кафедр, навукова-даследчы інстытут прыкладных фізічных праблем, 5 галіновых і праблемных навукова-даследчых лабараторый, спецыяльнае канструктарскае тэхналагічнае бюро з доследнай вытворчасцю. На 2,5 тысячы чалавек расшырыўся кантынгент студэнтаў, на 210 чалавек узрасла колькасць прафесарска-выкладчыцкага саставу.

Значна ўмацавалася за пяцігоддзе матэрыяльна-тэхнічная база універсітэта. Пабудаваны новы вучэбны корпус, корпус біястанцыі, два студэнцкія інтэрнаты, два шматкватэрныя жылыя дамы. Кафедры і лабараторыі універсітэта папоўніліся новай электронна-вылічальнай тэхнікай і тэхнічнымі сродкамі навучання. На 300 тысяч экземпляраў павялічыўся кніжны фонд бібліятэкі універсітэта.

**За пяцігоддзе БДУ падрыхтаваў і выпусціў 14 558 высокакваліфікаваных спецыялістаў па 15 спецыяльнасцях, у тым ліку 8 476 — па дзённай, 2 337 — па вячэрняй і 3 735 — па завочнай формах навучання.**

**Галоўнымі напрамкамі ўсёй дзейнасці калектыву універсітэта ў дзевятай пяцігодцы з'яўляліся:**

**— дасканаленне планавання і навуковай арганізацыі вучэбнага працэсу;**

**— павышэнне кваліфікацыі і метадычнага майстэрства прафесарска-выкладчыцкага саставу;**

**— укараненне новых прагрэсіўных метадаў навучання з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў;**

**— узмацненне ідэйна-выхаваўчай работы і на гэтай аснове вучэбнай дысцыпліны, павышэнне паспяховасці студэнтаў;**

**— дасканаленне арганізацыі навукова-даследчай работы, павышэнне яе актуальнасці і эфектыўнасці.**

Удасканальваўся ў дзевятай пяцігодцы вучэбна-выхаваўчы працэс. На малодшых курсах вучэбны працэс арганізаван па новых вучэбных планах. Перапрацаваны праграмы вучэбнай і вытворчых практык, уведзена грамадска - палітычная практыка студэнтаў, стажыроўка маладых спецыялістаў. Інтэнсіўна здзяйснялася ўкараненне прагрэсіўных метадаў навучання з прымяненнем тэхнічных сродкаў. Прыкметна павысіўся ўзровень выкладання грамадскіх дысцыплін. Належная ўвага ўдзялялася павышэнню ўзроўню ведаў будучых спецыялістаў па асновах педагогікі, псіхалогіі, этыкі і эстэтыкі, а таксама па асновах аховы навакольнага асяроддзя. Набыла дакладныя арганізацыйныя формы навукова-метадычная работа. Накоплен станоўчы вопыт палітыка-выхаваўчай работы, арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. Арганізаван і здзяйсняецца ўнутрыуніверсітэцкі кантроль за якасцю падрыхтоўкі спецыялістаў.

**Вялікая ўвага ўдзялялася павышэнню кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу. 1 260 чалавек павысілі сваю кваліфікацыю праз ФПК, ІПК і іншыя формы, 43 чалавекі абаранілі доктарскія і 236 чалавек — кандыдацкія дысертацыі.**

**На 24 працэнты павялічыўся за пяцігоддзе кантынгент аспірантаў. За гэты перыяд закончылі аспірантуру 511 чалавек. Працэнт аспірантаў, якія паспяхова закончылі навучанне, дасягнуў у 1975 годзе 60,3 супраць 25,5 працэнта ў 1970 годзе.**

Уся гэта работа па дасканаленню вучэбна-выхаваўчага працэсу і павышэнню кваліфікацыі выкладчыцкага саставу знайшла сваё канкрэтнае ўвасабленне ў паляпшэнні абсалютнай паспяховасці студэнтаў і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. За пяцігоддзе абсалютная паспяховасць павысілася на 5 працэнтаў і ў 1975 годзе на дзённай форме навучання склала 94,2 працэнта. На 20 працэнтаў павялічылася колькасць студэнтаў, якія абаранілі дыпломныя работы на «выдатна і «добра». Палепшылася вучэбная дысцыпліна студэнтаў, на 29 працэнтаў паменшыўся пропуск заняткаў без уважлівых прычын. Знізіўся адсеў студэнтаў дзённай формы навучання. Значна ўзрасла актыўнасць студэнтаў у выкананні навукова-даследчых работ.

**Значна павысіўся за гады дзевятай пяцігодкі тэарэтычны ўзровень і эфектыўнасць навуковых даследаванняў, паскорылася ўкараненне вынікаў навукова-даследчай работы ў народную гаспадарку і вучэбна-выхаваўчы працэс. Больш чым у два разы ўзрасла колькасць тэм, выконваемых па плану асноўных НДР універсітэта, у дваццаць разоў узрос эканамічны эфект, атрыманы ад укаранення вынікаў завершаных навукова-даследчых работ. У 1975 годзе ён склаў 10 млн. 690,9 тысячы руб.**

**Вялікі ўклад унесен вучонымі універсітэта ў выданне навуковых прац. Агульны аб'ём выданняў за пяцігодку склаў 539 назваў, у тым ліку 195 манаграфій, 69 зборнікаў навуковых прац, 183 падручнікі і вучэбныя дапаможнікі.**

**Ва універсітэце праведзена 8 навуковых канферэнцый саюзнага і 11 рэспубліканскага значэння.**

Разам са станоўчым у дзейнасці ў дзевятай пяцігодцы па дасканаленню падрыхтоўкі спецыялістаў ва універсітэце былі выкарыстаны не ўсе магчымасці для павышэння ўзроўню вучэбна-метадычнай і палітыка-выхаваўчай работы. У рабоце парткома, партыйных бюро факультэтаў, дэканатаў, кафедр і іншых падраздзяленняў універсітэта мелі месца значныя недахопы, на якія справядліва ўказвалася ў справаздачы ЦК КПБ XXVIII з'езду партыі. Калектывы кафедр і факультэтаў недастаткова працавалі са студэнтамі малодшых курсаў, мала ўдзялялася ўвагі арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, слаба здзяйсняўся кантроль за іх бягучай паспяховасцю. Выхаваўчай рабоце часам не хапала дзейснасці і эфектыўнасці. Недастаткова ўдзялялася ўвагі педагагічнай падрыхтоўцы студэнтаў для работы ў агульнаадукацыйнай школе. Меліся хібы ў планаванні вучэбнага працэсу, не заўсёды рацыянальна вырашаліся пытанні падбору і расстаноўкі навукова-педагагічных кадраў. Кіраўнікі кафедр універсітэта не заўсёды стваралі абстаноўку высокай патрабавальнасці да супрацоўнікаў, слаба кантралявалі выкананне прымаемых рашэнняў, нярэдка самі нясвоечасова і недастаткова адказна выконвалі дырэктывы і даручэнні рэктарата і аддзелаў універсітэта.

**Партком, савет, мясцком і камітэт камсамола пастанаўляюць:**

1. Адобрыць «Мерапрыемствы парткома, рэктарата і мясцкома Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна па выкананню рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ» і «Комплексны план ідэйна-выхаваўчай работы універсітэта на 1976—1980 гады».

2. Дэканам факультэтаў, загадчыкам кафедр, начальнікам аддзелаў і служб прыняць да няўхільнага выканання мерапрыемствы парткома, рэктарата і мясцкома універсітэта па ажыццяўленню рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ і комплексны план ідэйна-выхаваўчай работы універсітэта на 1976—1980 гады.

3. Падвесці вынікі дзейнасці факультэтаў, кафедр, аддзелаў за 1971—1975 гады і абмеркаваць іх на саветах факультэтаў, паседжаннях кафедр і нарадах аддзелаў і служб. Глыбока прадумаць і распрацаваць на дзесятую пяцігодку комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на далейшае паляпшэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй у адпаведнасці з рашэннямі XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ і патрабаваннямі іншых дакументаў партыі і ўрада па пытаннях вышэйшай адукацыі.

**У мерапрыемствах прадугледзець:**

**— узмацненне і павышэнне якасці работы па ўдасканаленню зместу універсітэцкай адукацыі;**

**— паляпшэнне форм і метадаў выкладання;**

**— усямерную інтэнсіфікацыю вучэбнага працэсу, арганізацыю яго на навуковай аснове;**

**— паляпшэнне камуністычнага выхавання студэнтаў;**

**— дасканаленне падбору, расстаноўкі і павышэнне кваліфікацыі навукова - педагагічных кадраў;**

**— пашырэнне навукова-даследчай дзейнасці, узмацненне яе сувязі з вытворчасцю;**

**— узмацненне вучэбна-матэрыяльнай базы кафедр і факультэтаў.**

4. Працягваць работу па вывучэнню пытанняў рацыянальнага выкарыстання бюджэту часу студэнтаў і арганізацыі іх самастойнай работы. Удасканальваць сістэму кантролю і ўліку бягучай паспяховасці студэнтаў.

5. Звярнуць асаблівую ўвагу загадчыкаў кафедр, дэканаў, начальнікаў аддзелаў і служб на ўзмацненне кантролю за выкананнем дырэктыў партыі і ўрада па пытаннях вышэйшай адукацыі, загадаў і распараджэнняў міністэрстваў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў СССР і БССР, а таксама рашэнняў і пастаноў саветаў універсітэта і факультэтаў, дабіцца, каб праверка выканання насіла, як таго патрабуюць XXV з'езд КПСС і XXVIII з'езд КПБ, дзейсны і сістэматычны характар. Шырэй развіваць крытыку і самакрытыку як выпрабаваны сродак паляпшэння работы ўсіх падраздзяленняў і служб універсітэта. Пастаянна ўдасканальваць формы і метады ўнутрыуніверсітэцкага і ўнутрыфакультэцкага кантролю за якасцю падрыхтоўкі маладых спецыялістаў.

6. У адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ ад 22 студзеня 1976 года «Аб Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы, за паспяховае выкананне народнагаспадарчага плана на 1976 год» шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва за паспяховае выкананне ўзятых абавязацельстваў.

Сістэматычна разглядаць на паседжаннях саветаў факультэтаў, кафедр, паседжаннях і нарадах аддзелаў і служб ход выканання сацыялістычных абавязацельстваў, забяспечыць шырокую галоснасць вынікаў спаборніцтва, прапагандаваць вопыт работы па дасканаленню вучэбна-выхаваўчага і навукова-даследчага працэсу лепшых кафедр, груп, аддзелаў. Пры арганізацыі і правядзенні сацыялістычнага спаборніцтва кіравацца пастановай калегіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прэзідыума прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў № 2/44 ад 16 студзеня 1975 года.

# НІВОДНАГА АДСТАЮЧАГА ПОБАЧ

Пад такім дэвізам прайшоў Усесаюзны камсамольскі сход «Рашэнні XXV з'езда КПСС — выканаем»на гістарычным факультэце. З велізарным уздымам успрыняўшы гістарычныя рашэнні XXV з'езда партыі, камсамольцы факультэта ўзялі курс на выкананне комплекснай праграмы мерапрыемстваў па вывучэнню і прапагандзе дакументаў партыйнага з'езда, рашэнню задач па далейшаму ўзмацненню камуністычнага выхавання моладзі. Камітэт камсамола факультэта, камсамольскія бюро курсаў, аддзяленняў і груп многае робяць для таго, каб стварыць на факультэце атмасферу творчага авалодання ведамі, каб прыцягнуць студэнтаў да актыўнай грамадскай работы. У камсамольскай арганізацыі гістфака паспяхова праведзена сацыялістычнае спаборніцтва за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола XXV з'езду КПСС. Яно садзейнічала далейшаму павышэнню баявітасці курсавых і групавых камсамольскіх арганізацый, росту актыўнасці камсамольцаў. Абмен камсамольскіх дакументаў на гістфаку прайшоў як важнейшае арганізацыйна - камсамольскае мерапрыемства, у выніку якога ўзрасла авангардная роля членаў ВЛКСМ, павысілася згуртаванасць камсамольскіх радоў, на новы ўзровень паднялася ўся ідэалагічная работа.

Па выніках дзевятай пяцігодкі гістфак заняў першае месца ва універсітэце па паспяховасці. Зімовую сесію 1976 года 166 студэнтаў факультэта здалі на «выдатна».

З году ў год шырыцца на факультэце ўдзел студэнтаў у СНТ. У 1975 навучальным годзе з дакладамі на навуковых канферэнцыях выступілі 452 камсамольцы. На рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх навуковых работ адной рабоце прысуджана прэмія, 8 работ удастоены першай катэгорыі, 22 работы — другой катэгорыі.

На сходзе было адзначана паляпшэнне культурна-масавай работы на факультэце. Гістфак заняў другое месца ва універсітэцкім аглядзе-конкурсе мастацкай самадзейнасці.

Работа баенна-патрыятычнага сектара камітэта ДТСААФ факультэта прызнана лепшай ва універсітэце. Сярод многіх добрых спраў, адзначаных у дакладзе сакратара камітэта камсамола гістфака У. Кузьмінава, важнае месца займае работа курсавых камсамольскіх арганізацый па фарміраванню студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Выступіўшыя на сходзе Г. Партнова, В. Мядзянік, сакратар камітэта камсамола універсітэта А. Тозік, сакратар партбюро гістфака І. Марчанка, сакратар ЦК ЛКСМБ У. Ягораў адзначылі ўзрастаючую ролю ўсіх камсамольскіх звенняў у рашэнні грандыёзных задач, пастаўленых XXV з'ездам партыі перад Ленінскім камсамолам краіны.

Камсамольскі сход пастанавіў зацвердзіць план мерапрыемстваў камітэта камсамола гістфака БДУ па выкананню рашэнняў XXV з'езда КПСС і далейшаму ўзмацненню камуністычнага выхавання моладзі і аднадушна прыняў прывітальнае пісьмо камсамольцаў факультэта Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі, Генеральнаму сакратару ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжневу.

**ПРЭС-ЦЭНТР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА БДУ.**

НА ФІЛФАКУ

## МОЙ ПЕРШЫ ЎРОК

ЯК І ЎСЕ студэнты-філолагі, будучыя настаўнікі, я таксама з вялікім хваляваннем і нецярпеннем чакала педагагічнай практыкі, калі я змагу даць свае першыя ўрокі, адчуць сябе настаўніцай. І вось, нарэшце, мы размеркаваны па групах і накіраваны ў розныя школы Мінска. Мы атрымалі накіраванне ў ШПМ № 7, у якой займаюцца рабочыя трактарнага завода. Практыка працягвалася роўна месяц. Сустрэлі нас вельмі цёпла. Школа добрая, свая бібліятэка, светлыя і прасторныя класы і кабінеты, дружны і зладжаны калектыў.

Мне назаўсёды запомніцца мой першы дзень педпрактыкі. Было крышку страшна, але пераадолець гэту баязлівасць дапамаглі вопытныя настаўнікі, спагадлівыя і добрыя людзі. Першыя дні мы знаёміліся са школай, прысутнічалі на занятках. Вельмі хацелася хутчэй даць самім урокі. Мы, студэнты-вячэрнікі, прыйшлі ў класы да сваіх вучняў. Першы ўрок. Перад намі—дарослыя людзі, якія таксама працуюць і вучацца.

І вось я вяду ўрок у 11-м «В» класе. Тэма — «Сучасная беларуская проза». Было радасна бачыць, што вучні разумеюць мяне, слухаюць з цікавасцю і захапленнем... Урок удаўся. Як гэта здорава, калі ты становішся упэўненым і можаш поўнасцю разлічваць на свае сілы!

Пасля нашых урокаў заўсёды праводзіліся абмеркаванні. Выступаем, указваем на недахопы і памылкі, робім вывады. Вельмі дапамагалі тут парады і падтрымка В. Каладзінскага, нашага метадыста.

Практыка дала нам шмат. Мы змаглі бліжэй пазнаёміцца са школай, мелі магчымасць праверыць свае веды, перадаць іх сваім вучням.

**З. ІГНАТАВА,**
**студэнтка V курса вячэрняга аддзялення філфака.**

НА ФІЛФАКУ

## «СЭРЦА АДДАЮ ДЗЕЦЯМ»

30 сакавіка на філалагічным факультэце адбылося паседжанне шэфскага сектара БДУ з кіраўнікамі падшэфных ГПТВ, гарадскіх і сельскіх школ. Быў заключан дагавор аб шэфскай рабоце на пяцігодку.

Філфак вядзе работу у 12 школах і трох домакіраўніцтвах. Студэнты працуюць з дзецьмі ўсіх узростаў, арганізоўваюць секцыі (гэта асноўная форма работы), праводзяць вечары і «агеньчыкі», рыхтуюць канцэрты.

— Мы шэфствуем над дзіцячым садам універсітэта. Тут вельмі цікава працаваць. Праводзім з малымі ранішнікі — «Падарожжа ў краіну казак», «Пра маму». Ходзім мы туды даволі часта.

З падшэфнымі школамі справа абстаіць некалькі інакш. Цяжкавыхоўваемыя падлеткі заўсёды былі праблемай нумар адзін. З імі вядзецца індывідуальная работа.

Слова — гасцям са 112-й сярэдняй школы г. Мінска:

— Нам хацелася б, каб вашы студэнты ўзялі па аднаму «цяжкаму» у будатрад...

— Вядома, — адказвае сакратар камітэта камсамола філфака Міхаіл Ціцянкоў, — будзе лепш, калі паедуць тыя, каго мы выхоўваем. Але пакуль падлеткаў нам выдзяляе дзіцячы пакой міліцыі. У будучым мы збіраемся браць з сабой у атрад старшакласнікаў, выдатнікаў вучобы з гарадскіх і сельскіх школ.

Нягледзячы на набліжэнне сесіі, планы шэфскага сектара БДУ аб'ёмныя: правесці на кожным факультэце дзень адкрытых дзвярэй, падрыхтаваць школьнікаў да выступлення з канцэртам на сцэне універсітэта, азнаёміць іх з БДУ.

Пытанне апошняе:

— Як адносяцца школьнікі да сваіх старэйшых таварышаў?

— Добра. Вучні вельмі дапытлівыя і цікаўныя, з імі нам самім цікава.

На гэтым пасяджэнні не было раўнадушных. Праблемы выхавання хвалявалі ўсіх. І недарэмна, відаць, педагагічны клуб філфака называецца — «Сэрца аддаю дзецям».

**В. КАСЦЮКЕВІЧ.**

НА ФІЛФАКУ



## ДОБРАЯ СІЛА ПРЫКЛАДУ

Выдатная вучоба, актыўная грамадская дзейнасць— усё сумяшчаць нялёгка, але Анатолію Гіруцкаму, студэнту IV курса філфака, камуністу, гэта ўдаецца.

— Велізарную ролю ў маім самавыхаванні адыграла служба ў радах Савецкай Арміі. Дысцыпліна, уменне правільна выкарыстаць кожную хвіліну свайго часу — у гэтым, безумоўна, адбілася армейская загартоўка. Адразу пасля службы ў арміі рашыў паступаць на філфак БДУ імя У. І. Леніна. На факультэце таварышы па групе аказалі мне вялікі давер, выбраўшы ўжо на першым курсе камсоргам групы, а затым старшынёй камітэта ДТСААФ. На другім курсе мяне выбралі намеснікам сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце,— сказаў Анатолій.

Права быць выбраным у камітэт камсамола атрымліваюць лепшыя з лепшых, хто праявіў сябе і ў вучобе, і ў грамадскай рабоце.

Задумаўшыся, Анатолій дзеліцца:

— Ідэалагічная работа мне найбольш блізкая, такім чынам я павышаю свой ідэйна-палітычны ўзровень. На III курсе мне даверылі ўжо больш сур'ёзную і адказную пасаду сакратара студэнцкай партыйнай арганізацыі. Быць выбраным на гэтую ганаровую і разам з тым вельмі нялёгкую пасаду—значыць трымаць экзамен праверкі тваіх якасцей не толькі як выдатніка вучобы, але, перш за ўсё, як актывіста грамадскай работы, арганізатара, які, ідучы заўсёды наперадзе, дапамагае і іншым заняць дастойнае месца ў радах выдатнікаў вучобы.

Колькі пытанняў часам даводзіцца рашаць старшыні прафбюро, абавязкі якога я выконваю цяпер, на IV курсе! І кожнае з іх па-свойму значнае, кожнае патрабуе ўвагі, сіл, энергіі. Іншы раз да позняга вечара даводзіцца займацца справамі, зусім мала застаецца часу на вучобу.

Але Анатолій знаходзіць хвіліну, каб і пачытаць, і схадзіць у кіно, і добра падрыхтавацца да заняткаў, напісаць рэферат. Анатолій з першага курса пастаянна выступае з дакладамі на навуковых канферэнцыях. «Класічная руская і савецкая літаратура» — галоўная тэма, якая хвалюе хлопца.

У мінулым годзе Анатолій удзельнічаў ва ўсесаюзнай навуковай канферэнцыі ў Калінінградзе, дзе выступаў з дакладам па класічнай рускай літаратуры.

— Удзел у навуковых канферэнцыях дапамагае расшыраць свой навуковы кругагляд, вучыць знаходзіць патрэбны, навукова абгрунтаваны падыход да многіх важнейшых праблем літаратуры і мовы і ў асаблівасці вучыць уменню пісаць, а галоўнае, працаваць з поўнай аддачай сіл на карысць любімай справе.

І гэтак заўсёды і ва ўсім. Неаднаразова Анатолій працаваў на ўдарнай камсамольскай будоўлі, на меліярацыі зямель у Кастрычніцкім раёне Гомельскай вобласці: прыйшлося быць і радавым байцом, і камісарам раённага штаба студэнцкага атрада.

Выдатніку вучобы, актывісту А. Гіруцкаму на III курсе была назначана стыпендыя імя Я. Коласа. зараз ён—ленінскі стыпендыят. Пажадаем жа і ўсім студэнтам як філфака, так і іншых факультэтаў універсітэта трымаць пастаяннае раўненне на сваіх таварышаў. лепшых з лепшых, такіх, як малады камуніст Анатолій Гіруцкі.

**В. КАСОЎСКАЯ.**
Фота **Т. Петрашкевіч.**

ІНТЭРВ'Ю НУМАРА

## ВЕДЫ—ЭСТАФЕТАЙ

Зусім нядаўна скончыў БДУ Уладзімір Міхайлавіч Мархонька. Сёння ён — малады выкладчык кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў.

**— Уладзімір Міхайлавіч, калі Вы пачалі працаваць выкладчыкам?**

— Толькі ў мінулым годзе, хаця аддзяленне палітэканоміі скончыў у 1972-м. Справа ў тым, што адразу пасля заканчэння універсітэта я паступіў у аспірантуру. Потым працаваў над дысертацыяй і, нарэшце, выкладчыцкая дзейнасць.

**— Групы, якія Вы вядзеце, розныя. Што Вы можаце аб іх расказаць?**

— Сапраўды, я вяду некалькі груп — на філфаку, на аддзяленнях гісторыі і палітэканоміі. Вячэрнікі — я працую з імі на гістфаку — народ самастойны, таму з імі лягчэй і цікавей займацца. Вучацца яны з большай аддачай, чым студэнты дзённага аддзялення. Не хачу гэтым сказаць, што на стацыянары няма сваіх працаўнікоў у сэнсе вучобы. У кожнай групе, на любым факультэце ёсць актыўныя і пасіўныя асобы.

**— У чым, на Ваш погляд, складанасць вядзення практычных заняткаў?**

— Неабходна сур'ёзна рыхтавацца да заняткаў самому выкладчыку. Здараецца такое, што студэнт не заўсёды можа адказаць на зададзенае пытанне, і не таму, што не ведае матэрыялу. Асаблівую ўвагу трэба ўдзяляць практычным заняткам, каб любыя пытанні былі зразумелымі і пры іх дапамозе можна было высветліць, наколькі добра знаём студэнт з дадзенай тэмай.

**— На Ваш погляд, ад быліся якія-небудзь змены ў аблічы студэнтаў? Чым характарызуецца студэнт-76?**

— Усяго тры-чатыры гады назад я сам быў студэнтам, таму інтэрвал не такі ўжо і вялікі. Прынцыповай розніцы не бачу, хаця змены ўсё ж ёсць. Напрыклад, сённяшні студэнт лепш, па-мойму, падрыхтаван з пункту гледжання эканамічна-матэматычнага. Ён хутчэй засвойвае матэрыял. З кожным годам удасканальваецца методыка выкладання, што таксама адыгрывае немалаважную ролю ў павышэнні ўзроўню ведаў студэнта.

**— Уладзімір Міхайлавіч, што Вы можаце сказаць аб сваёй працы?**

— Канешне. Працаваць вельмі цікава, і я задаволен выбарам прафесіі. Сапраўды адчуваеш сябе шчаслівым, патрэбным, калі бачыш, што тваё веды сталі ведамі другога чалавека.

Л. І. Брэжнеў гаварыў: «Настаўнікі як бы перадаюць эстафету працы з цяперашняга ў будучае». Па-мойму, свет падзелен на настаўнікаў і вучняў. І я лічу вялікім законам жыцця перадаваць веды эстафетай.

**Л. КАЧКО.**





*НА ЗДЫМКАХ: практычныя заняткі па палітэканоміі вядзе У. МАРХОНЬКА.*
Фота **Т. Петрашкевіч.**

# СУБОТНІМ ВЕЧАРАМ

Вясна... Яе прыход адчуваецца не толькі ў самой прыродзе, але і ў настроі студэнтаў. Гэта пара трывог і надзей, мар і здзяйсненняў.

Іменна ёй, красуні-вясне, і быў прысвечан «агеньчык» студэнтаў-першакурснікаў факультэта журналістыкі, які падрыхтавала першая група. Адбыўся ён у інтэрнаце № 2.

Давайце на хвілінку вернемся ў той суботні вечар. Рамантычны і ўзнёслы настрой падкрэслівала святочнае ўбранне залы. Яна напамінала абуджаны вясенні лес. На кожным століку — пачынаючая распускацца вярба...

Удзельнікі «агеньчыка» павінны былі прыдумаць самую вясновую, лірычную і смешную назву свайго століка. Колькі іх было перабрана — не пералічыць! Але аўтарытэтнае журы ў саставе куратара групы М. Каваленкі, старасты Т. Волкавай і ад гасцей — сакратара камсамольскай арганізацыі журфака У. Грыняка назвала пераможцаў: «Шпакі», «Буль-буль...», «Каханыя», «Кап-кап-кап», «Дыябетыкі». Салодкі прыз—торт.

Вядучыя — камсорг Ніна Валасюк і трэцякурснік Аляксандр Прастата — здзівілі ўсіх сваёй багатай фантазіяй. Яны прапаноўвалі ўсё новыя і новыя гульні і конкурсы. Пад аднагалоснае адабрэнне ім былі ўручаны сувеніры.

Думаецца, шо гэты «агеньчык» надоўга застанецца ў памяці аматараў гумару і музыкі.

Вось думка некаторых удзельнікаў:

**М. Каваленка,** куратар першай групы:

— Я нібыта зноў вярнуўся ў сваё юнацтва. «Агеньчык» напомніў мне самыя лепшыя і незабыўныя гады майго жыцця — студэнцкія гады. Добрыя рабяты сабраліся ў групе! Я веру ў іх дружбу.

**В. Гедройц,** першакурснік:

— Хацелася, каб падобныя мерапрыемствы праводзіліся часцей і іх удзельнікамі былі ўсе рабяты. А што датычыць мяне, то «агеньчык» мне вельмі спадабаўся.

**Т. БЯЛІЦКАЯ, Л. АСТАПОВІЧ.**




*Рэжысёру кінастудыі «Беларусьфільм» В. Дашуку прысуджана прэмія Ленінскага камсамола Беларусі за цыкл дакументальных фільмаў «Жанчына з забітай вёскі», «Нямы крык», «Жменя пяску». Віктар— выпускнік журфака БДУ. Нядаўна ён быў у гасцях у студэнтаў IV курса журфака. Рэжысёр пазнаёміў нас з дзвюма сваімі работамі —фільмамі «Трывожныя вышыні» і «Суд памяці».*

*Н. НОВІКАВА.*

*Фота В. Гедройца.*

## ТВОЙ ЭТЫКЕТ

# ЯШЧЭ РАЗ ПРА ДОБРЫЯ МАНЕРЫ

**Як сябе паводзіць? Гэтае пытанне цікавіць усіх, таму сёння мы друкуем нататкі аглядальніка польскага часопіса «Пшэкруй» Яна Камычака.**

Жэсты, паходка. Прыгожая паходка, постаць, прывабныя жэсты упрыгожваюць і мужчыну, і жанчыну. У выключных выпадках тым, што мы называем грацыёзнасцю, чалавек надзелен ад прыроды. Часцей гэтыя якасці набываюцца за кошт вялікіх намаганняў. Іх выхаванню дапамагаюць заняткі спортам, рытмікай, балетам.

Варта вучыцца прыгожа хадзіць, трымацца прама. І ніколі не стаяць на расстаўленых нагах. Неабходна ўмець лёгка і прыгожа падняцца па лесвіцы і гэтак жа прыгожа спусціцца па ёй. Галаву не трэба ўзнімаць вельмі высока, не трэба яе і занадта апускаць і ўжо тым больш — глядзець на ўсё спадылба.

Моладзь часта не ведае, «што рабіць з рукамі». Дзяўчыну, праўда, у такіх выпадках выратоўвае сумка, за якую можна «учапіцца», а ў юнака няма гэтага каштоўнага рэквізіту. Здаецца, самае натуральнае выйсце — трымаць рукі ў кішэнях. Толькі ці магчыма гэта з пункту гледжання добрага тону?

Непрыгожа размахваць рукамі ў час хадзьбы ці прагулкі, энергічна жэстыкуляваць імі ў час размовы. Пры пакашліванні трэба злёгку павярнуць галаву ўбок і прыкрыць рот рукой, пры рэзкім кашлі абавязкова прыкладаем да рота насоўку.

Вось некалькі парад:

— рукі старайцеся захаваць у спакоі, не тузайце ўвесь час гальштук, гузікі, рукаў партнёра;

— непрыгожа паварочвацца спіной да субяседніка, а таксама ні да каго іншага, хто стаіць паблізу;

— размаўляючы, старайцеся не паціскаць плячыма. Іншы раз мы нават не ўсведамляем таго, наколькі гэты жэст можа здацца крыўдным для субяседніка.

Яшчэ некалькі запаведзей, пра якія неабходна памятаць пастаянна. Нязетліва, а таму і непрыгожа: паказваць пальцам, асабліва на чалавека; разразаць старонкі часопіса ці кнігі грабянцом; выкарыстоўваць ногаць мізінца ў якасці зубачысткі, чысціць чаравікі аб калошыны штаноў, часта пазіраць на гадзіннік пры размове з госцем, жанчынай; ляпаць дзвярыма. Дзверы заўсёды трэба зачыняць «мякка», нават калі мы вельмі спяшаемся. Усё роўна, якія гэта дзверы: на працы, дома, ў магазіне, у машыне. У спрэчцы ляпанне дзвярамі не аргумент, а непрыстойны агрэсіўны выпад.

# ФЕСТЫВАЛЬ ДРУЖБЫ

З адкрыцця маляўнічай выстаўкі, якая расказвае аб развіцці Кубы пасля рэвалюцыі, аб культуры, спорце, эканоміцы краіны, аб жыцці індыйскага народа, аб прыгажосці чэхаславацкіх, польскіх гарадоў пачаўся святочны фестываль мастацкай самадзейнасці замежных студэнтаў. Пасля выстаўкі адбыўся канцэрт, на якім выступалі хлопцы і дзяўчаты з розных краін свету.

«...Уздоўж па вуліцы мяцеліца мяце...» Пералівеецца, гучыць у зале знаёмая мелодыя. На сцэне — танцавальная група замежных студэнтаў. Рускія нацыянальныя касцюмы, шчырыя ўсмешкі на тварах і гэта маладзецкая ўдаласць, без якой не абыходзіцца ніводны народны танец. З захапленнем танцуюць юнакі, стараючыся перадаць усю гаму фарбаў, настрой рускай пляскі. Узнагарода за выдатнае выкананне — гарачыя апладысменты гледачоў.

Няхай не зусім правільна гучалі рускія словы ў вершах Ясеніна, «Бялее парус адзінокі» Лермантава, але як прыемна было адчуваць, што і для гэтых хлопцаў і дзяўчат з далёкага Непала, астравоў Зялёнага Мыса, Камеруна, ГДР, Чэхаславакіі стала блізкай руская мова, што яны разумеюць вялікі сэнс дружбы. «Белы, чорны, жоўты — усе роўныя», — пранікнёна гучала ў прыціхшай зале.

«....Ты загінуў, але твае ідэі і справы жывуць у нашых сэрцах», — пяецца ў нацыянальнай песні студэнтаў з астравоў Зялёнага Мыса, песні, прысвечанай герою нацыянальна-вызваленчага руху.

«Блакітны канал», «Падарожжа па жыццю», нацыянальныя песні, якія выконвалі замежныя студэнты, расказвалі аб сваёй радзіме, аб цяжкай барацьбе народа за свабоду і незалежнасць.

Доўга не адпускалі гледачы са сцэны выканаўцаў папулярных песень «Травы, травы», «Надзея», «Лебядзіная вернасць», «Калінка». Асаблівым поспехам карысталася беларуская песня «Ручнікі», якую выканаў студэнт з Іярданіі.

Да позняга вечара не змаўкалі музыка, песні, не канчаліся танцы ў актавай зале. Фестываль мастацкай самадзейнасці замежных студэнтаў, які адбыўся 3 красавіка ва універсітэце, стаў сапраўдным святам дружбы, песні, маладосці. **С. ІВАНОВА.**



**Пад вясновым сонцам. Фота А. НІКАЛАЙЧЫКА.**

# ЭЦЮД

...Зараз яна была для мяне птушкай. Здавалася, вось-вось узнімецца і паляціць у блакітны небасхіл. А ён быў не па вясенняму белы, жменямі сыпаў на зямлю крохкія, крыштальныя сняжынкі, што садзіліся на яе валасы, як матылькі.

Вецер так і сцябаў злосцю ў твар, спрабуючы спыніць нас. Дрэвы шумелі, нібы спрачаліся са снежнай красавіцкай віхурай. Яны хваляваліся за жыццё толькі-толькі паявіўшыхся на свет пушынак. Некаторыя сталі моўчкі, нерухома, быццам згаджаліся з прыродай.

Адзінокі пенсіянер, засядзеўшыся на лаўцы, пабялеў, як снегавік, і хітравата паглядаў у наш бок.

— Ой, цуд які, глядзі! — усклікнула Наташа.

З-пад снегу выглядвалі... кветкі. Блакітныя агеньчыкі свяцілі сярод бяскрайняй белай прасторы.

— Які ж гэты цуд,— здзіўлена прагаварыў Снегавік. — Вось цуд—каб у красавіку, ды такі снег валіў! А моладзь, што ёй? Кветкам нейкім здзіўляецца...

Сярдзіты, ён падаўся прэч.

— Сняжынкі не пашкадавалі пралесак,— ціха прамовіла Наташа. — Мне так іх шкада.

— Гэта апошні снег, прабачым яму...

Нас ужо ніхто не бачыў за снежнай завесай. ...Я цалаваў яе, і мне здавалася, што я цалую заснежаныя кветкі...

**А. ХАРЛАМАВА.**

## ЛІСТОК ДАІ

# НАСУСТРАЧ УСЕСАЮЗНАМУ АГЛЯДУ

Зусім нядаўна праводзіўся Усесаюзны агляд бяспекі руху на аўтатранспарце, і вось зноў, праз 5 месяцаў, уся работа Дзяржаўтаінспекцыі цалкам і поўнасцю будзе прысвечана гэтаму важнаму мерапрыемству.

Агляд, які праводзіўся ў кастрычніку мінулага года, заклаў добры фундамент году бягучаму: аварыйнасць была зніжана амаль па ўсіх паказчыках. На жаль, ужо да 20 сакавіка 1976 года ў горадзе зарэгістравана 115 дарожна - транспартных здарэнняў, у якіх 6 чалавек загінула, 132 атрымалі раненні. Такое становішча спраў патрабуе істотнага паляпшэння дысцыпліны руху на дарогах.

У мэтах прыцягнення ўвагі арганізацый, ведамстваў, усіх вадзіцеляў і пешаходаў да праблем папярэджання транспартнай аварыйнасці з 1 па 30 красавіка і праводзіцца агляд - праверка практычнага ўкладу кожнай арганізацыі, кожнага вадзіцеля і пешахода ў работу па барацьбе з аварыйнасцю на аўтатранспарце.

Згодна з распрацаваным планам мерапрыемстваў амаль на ўсіх прамысловых і аўтатранспартных прадпрыемствах у час агляду пройдуць сустрэчы і гутаркі работнікаў ДАІ з калектывамі працоўных. Для паляпшэння ўмоў руху у час агляду будуць укараняцца і ўдасканальвацца сродкі рэгулявання рухам. План прадугледжвае таксама і правядзенне праверак тэхнічнага стану транспарту, намечан рад мер па паляпшэнню якасці падрыхтоўкі вадзіцельскіх кадраў. Найбольшую нагрузку ў час агляду будзе несці дарожны нагляд, які заклікан выяўляць і стрымліваць парушэнні правіл руху. У кожным раёне горада будуць праводзіцца рэйды па бяспецы руху з удзелам народных дружын, прадстаўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў горада.

**Ю. РАЖАЎ,**
**супрацоўнік ДАІ.**





Нядаўна ва універсітэце праходзілі спаборніцтвы па ваенна-прыкладных відах спорту. Лепшыя вынікі ў практыкаванні МВ-1 паказалі студэнты І. Лабко, П. Прадуха (мехмат), А. Прыпечанкаў (хімфак), А. Кузьмін (біяфак), М. Кутынка (ФПМ), якія набралі вышэйшыя балы — 99—98 ачкоў. Сярод дзяўчат першымі былі А. Субач (ФПМ), Н. Нішыт (хімфак).

**НА ЗДЫМКАХ:** вынікі стральбы праглядае **М. КУТЫНКА (ФПМ)** — грамадскі інструктар факультэта па стральбе; член зборнай БДУ, першаразраднік **В. БАРУЛІН**; страляе **Т. ДРАЗДОВА (ФПМ).**

«Белорусский университет» — орган парткома, ектората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 04170 Заказ № 502.

В. а. рэдактара В. Д. РОШЧЫН.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.